# Паэзія як чараўніцтва

Днямі ў гарадской дзіцячай бібліятэцы № 4 адбылася сустрэча з мясцовым паэтам **Васілём Андрыеўскім**. На яе былі запрошаны вучні старэйшых класаў СШ № 9. Удзельнікі мерапрыемства ўважліва слухалі вершы паэта-земляка, цікавіліся гісторыяй іх напісання. Паэт пазнаёміў прысутных са сваімі аўтарскімі паэтычнымі зборнікамі, а таксама прадэманстраваў шэраг калектыўных выданняў, складальнікам і рэдактарам якіх ён з'яўляецца. Падчас сустрэчы вучні задавалі паэту пытанні, на якія атрымалі змястоўныя адказы. Да мерапрыемства была падрыхтавана кніжная выстава, прысвечаная творчасці Васіля Андрыеўскага, пад назвай «Дзіўны горад, родны горад!..».

**Наталля ЗДАНЕВІЧ,**
**бібліятэкар.**